**Л.А. Сугака (*г. Магілёў*)**

# АБ САЦЫЯЛЬНЫМ, НАЦЫЯНАЛЬНЫМ І ГЕНДЭРНЫМ СКЛАДЗЕ ЭВАКУІРАВАНАГА НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСКАЙ ССР (1941–1944 гг.)

Ужо ў першыя дні Вялікай Айчыннай вайны катастрафічнае для Чырвонай Арміі развіццё падзей на захадзе БССР абумовіла неабходнасць аператыўнай арганізацыі шырокамаштабнай эвакуацыі ў глыбокі савецкі тыл вытворчых сіл рэспублікі. У пачатку вайны эвакуацыйны працэс на тэрыторыі Беларусі працягваўся да другой дэкады жніўня 1941 г., паступова набываў больш арганізаваныя формы. У меншай ступені гэта тычыцца зыходу ў тыл грамадзянскага насельніцтва, тут на працягу ўсяго эвакуацыйнага перыяду дамінавала стыхійнасць. Таму не быў наладжаны дакладны улік грамадзян, якія пакінулі рэспубліку ў першыя месяцы вайны. Айчынная гістарыяграфія савецкага часу ацэньвала колькасць эвакуіраванага летам 1941 г. насельніцтва Беларусі ў 1,5 млн. чалавек. Сёння гэта лічба аспрэчваецца ў шэрагу публікацый, дзе рэальная колькасць бежанцаў з БССР вызначаецца ў 700–800 тыс. чалавек [1, с. 6–7; 2, с. 26; 3, с. 127–129]. Такім чынам, уяўляецца магчымым канстатаваць, што застаецца адкрытым пытанне аб дакладнай колькасці насельніцтва, якое пакінула Беларусь ў пачатку вайны. Няма поўнай яснасці і наконт яго сацыяльнага, нацыянальнага і гендэрнага складу. У дадзенай публікацыі робіцца спроба праліць святло на ўзгаданы аспект.

Летам 1941 г. ў БССР эвакуацыйныя мерапрыемствы ахапілі, галоўным чынам, гарады. Іх насельніцтва складала абсалютную большасць сярод бежанцаў. У сельскай мясцовасці, па дадзеным Л.С. Скрабінай, "...эвакуация не проводилась, не было никакой информации об эвакопунктах. Лишь немногие жители... смогли уехать на близлежащие железнодорожные станции. Практически всё сельское население осталось под оккупацией..." [4, с. 61]. 18 ліпеня 1941 г. Бюро ЦК КП(б)Б абавязвае Цэнтральную эвакуацыйную камісію пры СНК БССР "...привлечь сельское население к эвакуации" [5, с. 27–28]. На той момант гэта было магчыма толькі ў Палескай, Гомельскай і часткова Магілёўскай абласцях. Аднак і тут эвакуацыя закранула вельмі нязначную частку сельскіх жыхароў – прадстаўнікоў калгасна-саўгаснай адміністрацыі, тэхнічны персанал МТС, гуртоўшчыкаў, якія пераганялі на ўсход жывёлу.

Звесткі аб сацыяльным, нацыянальным і гендэрным складзе эвакуіраванага насельніцтва рэспублікі адлюстроўвае інфармацыя, якую збіралі упаўнаважаныя ЦК КП(б)Б і СНК БССР. Восенню 1941 г. яны былі камандзіраваны ў некаторыя тылавыя рэгіёны краіны з мэтай арганізаваць, ва узаемадзеянні з мясцовымі уладамі, улік, размяшчэнне і працаўладкаванне эвакуіраваных жыхароў Беларусі [5, с. 80–82]. Работа па іх рэгістрацыі вялася даволі марудна і на жнівень 1942 г. па 28 абласцям і аўтаномным рэспублікам РСФСР была улічана 108787 чалавек [6, арк. 6]. Праўда, звесткі аб сацыяльна-прафесійным статусе, да і то часткова, маюцца толькі па 7795 асобам, якія знаходзіліся ў Башкірскай, Татарскай і Чувашскай АССР, Куйбышаўскай, Чэлябінскай і Свярдлоўскай абласцях [6, арк. 12]. Дадзеныя СНК БССР, што нас цікавяць, сістэматызаваны ў табліцах 1 і 2.

*Табліца* 1

**Нацыянальны і гендэрны склад эвакуіраванага насельніцтва БССР (на жнівень 1942 г., улічана 108787 чалавек)**

| Нацыянальнасць | Мужчыны | % | Жанчыны | % | Усяго | % |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Беларусы | 7500 | 6,9% | 13368 | 12,3% | 20868 | 19,2% |
| Рускія | 6196 | 5,7% | 18235 | 16,5% | 24431 | 22,2% |
| Украінцы | 434 | 0,4% | 978 | 0,9% | 1412 | 1,3% |
| Яўрэі | 22607 | 20,8% | 35775 | 33,1% | 58382 | 53,9% |
| Іншыя | 1521 | 1,4% | 2173 | 2,0% | 3694 | 3,4% |
| Усяго | 38258 | 35,2% | 70529 | 64,8% | 108787 | 100 % |

[6, арк. 6-7, табліца складзена аўтарам].

*Табліца* 2

**Сацыяльна-прафесійны статус эвакуіраваных жыхароў БССР (на жнівень 1942 г., улічана 7795 асоб, у %)**

| Катэгорыя | Мужчыны | Жанчыны | Усяго |
|---|---|---|---|
| Рабочыя | 6,9 | 3,2 | 10,1 |
| Служачыя | 1,9 | 3,6 | 5,5 |
| Спецыялісты | 1,9 | 6 | 7,9 |
| Калгаснікі | 1,1 | 5 | 6,1 |
| Утрыманцы | 10 | 14,8 | 24,8 |
| Прафесія не вызначана | 15,4 | 30,2 | 45,6 |
| Усяго | 37,2 | 62,8 | 100 |

[6, арк. 10, 12, табліца складзена аўтарам].

Істотная колькасная перавага жанчын сярод улічанай часткі эвакуіраваных жыхароў Беларусі выглядае натуральнай з'явай. Хаця б таму, напрыклад, што ў пачатку вайны у Чырвоную Армію было мабілізавана 548 тыс. ваеннаабавязаных рэспублікі, у абсалютнай большасці мужчын [6, арк. 2]. Акрамя таго, вельмі верагодна, што на жнівень 1942 г. ва Узброеныя Сілы была накіравана і пэўная колькасць мужчын ужо з ліку эвакуіраваных жыхароў БССР. Што тычыцца нацыянальнага складу іх улічанай часткі, то для абгрунтаваных, навукова карэктных высноў патрэбны адпаведныя дадзеныя па ўсяму колькаснаму масіву бежанцаў з БССР. Тое самае адносіцца і да вызначэння іх сацыяльна-прафесійнага статуса. Адносна значнай долі тых, чыі прафесіі не установлены, выкажам наступнае меркаванне. Верагодна, камандзіраваныя для рэгістрацыі бежанцаў работнікі не заўсёды мелі магчымасць для непасрэдных кантактаў з імі. У гэтым выпадку за неабходнай інфармацыяй яны звярталіся ў мясцовыя органы ўлады, якія, магчыма, не заўжды фіксавалі прафесію ці сацыяльны статус эвакуіраваных грамадзян.

Савецкія эвакуацыйныя мерапрыемствы працягваліся на тэрыторыі Беларусі і ва умовах германскай акупацыі. Насельніцтва выводзілася партызанамі у савецкі тыл праз Віцебскія (Суражскія) "вароты" (1942 г.); пакідала захопленую рэспубліку праз разрывы ў лініі фронта (1942–1944 гг.); выходзіла на вызваленую тэрыторыю у выніку спецыяльных аперацый партызанскіх фарміраванняў (1943–1944 гг.); дастаўлялася на "Вялікую зямлю" транспартнай авіяцыяй (1942–1944 гг.). У адрозненні ад эвакуацыі 1941 г., калі асноўнай масай бежанцаў былі жыхары гарадоў, у 1942–1944 гг. рэспубліку пакідала сельскае, галоўным чынам, насельніцтва, пераважна беларускае па свайму нацыянальнаму складу. Напрыклад, у жніўні 1942 г. партызаны праз Віцебскія "вароты" вывелі ў савецкі тыл 469 сямей (1253 чалавек, ў большасці сваёй жанчыны, дзеці, старыя) з 18 вёсак Суражскага, 7 вёсак Віцебскага, 4 вёсак Полацкага, 1 вёскі Асвейскага раёнаў [7, арк. 47–75]. З 1 снежня 1942 г. па 15 лютага 1943 г. праз Тарапецкі эвакапункт (Калінінская вобласць) у тылавыя рэгіёны Савецкага Саюза было накіравана 282 чалавекі (82 мужчыны, 137 жанчын, 63 дзіцяці і падлетка, усе – сельскія жыхары), якія выйшлі з акупіраванай тэрыторыі БССР [8, арк. 37]. Беларускія гарады жорстка кантраляваліся акупантамі, масавы зыход насельніцтва з іх быў немагчымы.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У лютым – чэрвене 1944 г. савецкае ваеннае камандаванне праводзіла эвакуацыю грамадзянскага насельніцтва ў вызваленых ад ворага раёнах рэспублікі. Арэал эвакуацыі ахопліваў зону шырынёй 25 км, якая прылягала да перадавой. Зона праходзіла уздоўж лініі фронта і прадстаўляла з сябе выключна сельскую мясцовасць. Таму можна не сумнявацца, што абсалютная большасць эвакуіраваных з яе людзей (па нашым дадзеным – 400–430 тыс. чалавек) былі сельскімі жыхарамі і беларусамі. Сярод іх пераважалі жанчыны, дзеці і старыя, бо шмат хто з мужчын прызыўнага узросту гэтых раёнаў ужо знаходзіўся у шэрагах Чырвонай Арміі [9, с. 26, 147].

Такім чынам, ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны на усход рушыла пераважна гарадское насельніцтва, якое мела даволі стракаты нацыянальны і сацыяльна-прафесійны склад. У 1942–1944 гг. з акупіраванай, а ў 1944 г. і з прыфрантавой зоны вызваленай тэрыторыі БССР ў савецкі тыл выходзіла сельскае насельніцтва, этнічна беларускае у абсалютнай большасці. Ва ўсіх выпадках доля жанчын сярод бежанцаў была істотна большай за долю мужчын.

У заключэнне канстатуем неабходнасць правядзення далейшых даследаванняў па азначанай праблематыцы. Перш за ўсё маем на увазе эвакуацыю 1941 г.

ЛІТАРАТУРА


1. *Иоффе, Э.* Результаты эвакуации населения БССР (1941–1943). Новые материалы // Гісторыя: праблемы выкладанн. – 2011. – № 2.
2. *Іофе, Э.* Эвакуацыя насельніцтва БССР летам 1941 года: сведчанні дакументаў, успаміны відавочцаў, меркаванні даследчыкаў // Беларус. гіст. часопіс. – 2011. – № 6.
3. *Сугако, Л.А.* Ход и итоги эвакуации населения БССР летом 1941 года: проблемные аспекты. - Известия Гомельского гос. ун-та им. Ф. Скорины. Гуманитарные науки. – 2011. – № 5.
4. *Скрябина, Л.С.* К проблеме эвакуации населения Беларуси в тыловые районы СССР. – Беларусь. 1941–1945. Подвиг. Трагедия. Память: в 2 кн. Кн. 2. – Мн., 2010.
5. Беларусь в первые месяцы Великой Отечественной войны (22 июня – август 1941 г.): документы и материалы. – Мн., 2006.
6. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 4п, воп. 33, спр. 225.
7. НАРБ. Ф. 4п, воп. 33а, спр. 391.
8. НАРБ. Ф. 4п, воп. 33а, спр. 150.
9. *Лемяшонак, У.І.* Вызваленне – без грыфа "Сакрэтна!". – Мн., 1996.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова